Нікуліна, Л. Памяць удзячных нашчадкаў / Л. Нікуліна // Аршанская газета. – 2023. – 21 чэрв. – С. 6.

## ПАМЯЦЬ УДЗЯЧНЫХ НАШЧАДКАЎ

**Вялікая Айчынная вайна стала адной з самых значных старонак у гісторыі Беларусі. Бітва савецкага народа супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў стала для БССР цяжкім выпрабаваннем.**



**Мемарыяльны комплекс «Рыленкі»**

На брацкіх могілках каля в. Рыленкі пахаваны савецкія воіны, якія засталіся навечна ляжаць на месцы свайго апошняга бою. 3 кастрычніка 1943 г. па чэрвень 1944 г. у гэтых месцах праходзіла лінія фронта. Тут пачалася аперацыя «Баграціён», падчас якой Беларусь была вызвалена ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Былыя воіны на ўсё жыццё запомнілі тую цяжкую бітву, якая панесла за сабой нямала страт. Аднак беларускі народ годна вытрымаў гэты ўдар, адстаяўшы перад ворагам свае права на жыццё. 26 чэрвеня войскі 31-й арміі пашырылі прарыў варожай абароны. Пасля цяжкіх баёў савецкія войскі прарвалі абарону, у выніку чаго фашысты паспешна сталі адыходзіць. 26 чэрвеня 1944 года быў вызвалены г. Дуброўна. Цяпер тут узвышаецца мемарыяльны комплекс «Рыленкі» скульптара М. Рыжанкова і архітэктара М. Ткачука. Ён быў адкрыты 3 ліпеня1973 года. Знаходзіцца комплекс на Рыленскіх брацкіх могілках савецкіх воінаў 30-й гвардзейскай стралковай дывізіі 10-й гвардзейскай арміі Заходняга фронта, 84-й гвардзейскай і 331-й стралковай дывізіі 31-й арміі трэцяга Беларускага фронта.

Мемарыяльны комплекс займае тэрыторыю амаль тры гектары і размешчаны перпендыкулярна трасе. Уяўляе сабой прасторавую архітэктурна-скульптурную кампазіцыю з сіметрычна-восевай планіроўкай. Уваход у мемарыял утвораны дзвюма апорнымі сценамі рознага памеру з манументальным рэльефам, на якім намаляваны мужныя твары савецкіх воінаў – «Тут 10 тысяч гераічна загінуўшых савецкіх салдат». Таксама ў склад комплексу ўваходзяць 4 стэлы, якія адлюстроўваюць подзвігі герояў, здзейсненыя на гэтай зямлі. Брацкія могілкі размешчаны ў выглядзе прамавугольных тэрас, па перыметры якіх устаноўлены 170 надмагілляў з імёнамі загінуўшых воінаў. Ад магіл да трасы вядзе алея, па абодва бакі якой.размешчаны 4 экспазіцыі, прысвечаныя подзвігам герояў Савецкага Саюза Ю. В. Смірнова, распятага фашыстамі на сцяне бліндажа; А. М. Васільева, які паўтарыў подзвіг А. М. Матросава; Г. А. Нікандравай, якая падняла байцоў у атаку, а таксама лётчыкаў С. М. Астахава і Бруна дэ Фальтана, якія загінулі ў адным самалёце. Таксама на тэрыторыі комплексу знаходзіцца адзіны ў Беларусі помнік медсанбату, які ратаваў тысячы салдацкіх жыццяў. У 2010 г. нашчадак аднаго з загінуўшых салдат узвёў тут капліцу, яе галоўную сцяну ўпрыгожвае вялікі Аўгустоўскі абраз Божай Маці. Завершаны комплекс маналітнай плітой з надпісам «Подзвігі вашы несмяротныя», перад якой гарыць Вечны агонь. Мемарыяльны комплекс «Рыленкі» – адзін з самых яркіх помнікаў, прысвечаных гераізму Савецкай арміі, які нясе ў сабе шмат слёз смутку па загінулых воінах, якія даравалі нам радасць мірнага жыцця, заваяванага такой дарагой цаной. Тут знайшлі апошні прытулак больш за 10 тысяч чырвонаармейцаў, якія загінулі ў раёне бліжэйшых вёсак. Штогадова ў гонар Дня Перамогі адбываецца традыцыйны цырыманіял на салдацкім пахаванні, дзе разам са сваякамі загінуўшых і мясцовымі жыхарамі з навакольных вёсак Дубровеншчыны прадстаўнікі арганізацый ушаноўваюць памяць воінаў, якія аддалі сваё жыццё за радзіму, хвілінай маўчання і ўскладаннем вянкоў. Дзякуючы клубу ЮНЭСКА «Русічы» былі праведзены пошукавыя работы. У выніку былі перапахаваны больш за 500 астанкаў нашых салдат, знойдзеных на месцах бітваў. Мемарыял утрымліваецца ва ўзорным парадку. У 2019 г. была праведзена яго рэканструкцыя. Кветкі, залпы гармат, схіленыя галовы – пацвярджэнне таго, што подзвігі салдат Вялікай Айчыннай вайны жывуць у нашых сэрцах і памяці ўдзячных нашчадкаў.

**Л. НІКУЛІНА,**
**вядучы архівіст**
**дзяржаўнага архіва г. Оршы.**